**Міхно, У.** «Тата зрабіў правільна, што пайшоў на вайну» / У. Міхно // Чырвоны прамень (Чашнікі). — 2002. — 16 лют. — С. 2.

# «ТАТА ЗРАБІЎ ПРАВІЛЬНА, ШТО ПАЙШОЎ НА ВАЙНУ»

АФГАНІСТАН. Краіна, назва якой зноў на слыху. На гэты раз, пачуўшы яе, мы ўзгадваем пра амерыканскія гмахі і пра Бен Ладэнэ. Але для нас, для жыхароў былога Саюза, Афганістан па-ранейшаму застаўся сімвалам болю, мужнасці,пакаяння... Як для каго. Напаўзабытая і ўжо далёкая вайна. Шаснаццаць гадоў, я пакінуў чужую краіну апошні савецкі салдат. Салдат-вызвалі цель? Салдат-заваёунік? Салдат-ахвяра чыіхсьці палітычных амбіцый? Шаснаццаць гадоў... І ўжо ў нашых «афганцаў» выраслі дзеці. Што скажуць яны пра сваіх бацькоў і пра ТУЮ вайну?

Так, сёння мы вырашылі расказаць пра воінаў-афганцаў вуснамі іхніх дзяцей. Кажуць, вуснамі дзіцяці гаворыць ісціна. Вучацца ў школе № 2 г. Чашнікі дзеці былых «афганцаў» Наташа і Саша Стомы, а таксама Тоня Кулакоўская. Прыемныя, дарэчы, дзеці, вельмі камунікабельныя, свой пункт погляду маюць і вучацца добра. Такімі, напэўна ж, ганарацца бацькі. А што пра бацькоў думаюць дзеці?



Саша: – Мой тата працуе электрыкам на заводзе харчовых прадуктаў. Завуць яго Сяргеем Эдуардавічам, яму 37 гадоў. Тата заўсёды не вельмі ахвотна ўспамінаў пра тое, як ваяваў у Афганістане, але апошнім часам ён неяк часцей стаў расказваць пра тую вайну. Ён служыў ў Кандагары артылерыстам. Кажуць, што гэта самая цяжкая, самая гарачая кропка была. Нават песня ёсць такая: «Давайте вспомним о служивших в Кондагаре...».

– Бацька твой расказваў, як ён трапіў у Афганістан?

– Спачатку яго адправілі ў Мар'іну Горку, затым у вучэбку, у туркменскі горад Мары. Ведаеце, бацька параўноўвае, як цяпер служаць у вучэбцы і тады як служылі. Усё было па-іншаму. Там можна было навучыцца абараняць краіну. Калі вучылі страляць, дык так, што пад канец дня ўжо рука не дзейнічала, стамлялася.

– Што расказваў табе бацька пра краіну, у якой ваяваў?

– Клімат там вельмі гарачы. Яйка курынае пакладзеш на браню танка – спячэцца. З вадой было праблем. Часта пілі ваду з рэчкі, брудную і жоўтую. Як жа рэчка называлася? Чакайце, па-мойму Арганда. Тавараў у Афганістане было ўсялякіх навалам. Нават у нас зараз такіх не сустрэнеш. Бацька казаў, у іх калі джынсы зношваюцца, на іх праступае нейкі малюнак, скажам, конь ці яшчэ што.

– У іх былі грошы? Ім было за што купляць тавары?

– Грошы былі. Шкада, што нічога дамоў з сабою забіраць не дазвалялася...

– Што ведаеш пра вайну?

– Я не помню, у якім званні ваяваў бацька, але ён казаў, што не па званнях, а па справе там цанілі чалавека. Зараз амерыканцы хваляцца, што знойдуць Бен Ладэна. Бацька кажа, гэта пустое, у іхніх пячорах і сам чорт схаваецца.

Наташа: – Яшчэ тата казаў, што многа сяброў у яго забілі. Выпадак быў такі. У таты пад час вайны згубіўся сябар. І вось аднойчы, ужо калі мір быў, цягнік пад'ехаў, і тата ўбачыў свайго сябра без нагі. Потым званіў яму.

– Яны і зараз падтрымліваюць сувязь, і з іншымі «афганцамі» таксама? Саша: – Не ведаю. У госці не ходзяць, але ведаюцца, на святы збіраюцца разам. У жніўні ў іх ёсць свята. І калі хто з іх памрэ, таксама едуць на пахаванне. Аднойчы бацьку паведамілі, што ў яго памёр сябар у Новалукомлі. Гэта было якраз на мой дзень нараджэння. Тата паехаў на хаўтуры. Яшчэ ён ездзіў у Мінск, калі адкрывалі помнік на Востраве Слёз. І буклет у яго ёсць.

– За што вы любіце (а па ўсім відаць, што гэта так) свайго бацьку? Хто ён для вас: сябар, настаўнік ці хто іншы?

Саша: – Увогуле, я прывык самастойна прымаць рашэнні. Але бацька, ён вучыць мяне жыць. І па прафесіі сваёй, па электрыцы, вучыць. Ледзь што, так і пайшло: закон Ома, закон Кергофа, Ленца, правіла бураўчыка...

Наташа: – Тата вельмі добра ўмее варыць есці.

Саша: – Ого! Яшчэ як. Аднойчы мама ездзіла на курорт, і мы жылі адны. Тата варыў нам афганскі плоў. Любіць, каб рыс рассыпаўся, і кажа, што тут у нас такога рысу няма, як быў там, у Афгане. Ён расказваў, аднойчы яны там зарэзалі барана. І «дзяды» запыталіся ў іх, хто ўмее гатаваць. Тата адгукнуўся. Барана вымачылі ў нейкім бачку, качалі той бачок па зямлі, і затым плоў зрабілі. Усім спадабалася.

– У бацькі ёсць узнагароды?

Наташа: – Медалі ёсць, граматы. Казалі, што медаль пасля вайны ўжо ў ваенкамат прыйшоў. Але тата не лічыць, што ўзнагароды – самае галоўнае.

Саша: – На мой погляд, тая вайна, на якой бацька ваяваў, была непатрэбнай, але яна многаму навучыла. Калі ён вярнуўся, яшчэ жывая была яго бабуля, і яна не пазнавала бацьку, так моцна ён загарэў быў, схуднеў.

Наташа: – Тата мой сябар. Учора мы з ім разам магнітафон рамантавалі. Часам, хоць і рэдка, бываем на стадыёне. Тата гуляе ў тэніс і ў валейбол. А я хаджу на турбазу, у турыстычны гурток.

– Будзеш спартсменкай?

– Яшчэ пакуль не вырашыла.

Саша: – І я таксама не вырашыў, кім буду. З трох адно: альбо банкаўскім работнікам, альбо праграмістам, альбо выкладчыкам замежнай мовы. А ваенным не буду.

Тоня: – І мой бацька таксама ваяваў у Афганістане. А зараз ён у камунгасе кранаўшчыкам працуе. Завуць яго Васілём Міхайлавічам. І яму 34 гады. Ім камандзір яшчэ ў вучэбцы шчыра прызнаўся, што іх рыхтуюць у Афганістан. Папрасіў выйсці са строю тых, хто не паедзе на вайну. Выйшлі трое. Бацька застаўся стаяць у страі. Тата правільна зрабіў, што паехаў на вайну.

– Атых, хто не паехаў, ты асуждаеш?

– Таксама не. Напэўна, у іх былі прычыны. Але ж некаму трэба было і ваяваць. Было вельмі цяжка, спякотна. Некаторыя не вытрымлівалі, падалі, нават паміралі. А купацца не дазвалялі. Адзін салдат пакупаўся, яго пакаралі. І тату аднойчы пакаралі. За тое, што ён выстраліў лішні раз. Яго прымусілі паўзці ў

процівагазе. Камандзіры паступалі жорстка, але, мне здаецца яны правільна рабілі, бо патрэбна была дысцыпліна. Каб выжыць. Тата казаў: яму дапамагло выжыць яшчэ тое, што ён нарадзіўся на Каляды. У яго таксама ёсць баявыя ўзнагароды. А пісьмы з Афганістана ён пісаў вельмі кароткія. Часам толькі два радкі: жывы, здаровы...

Наташа: – Я таксама люблю чытаць бацькавы пісьмы з вайны.

– А вы хацелі б, каб нашы хлопцы служылі ў гарачых кропках, ваявалі на розных войнах?..

На гэтае пытанне дзеці адказалі дружна і адназначна: вядома ж не.

...То няхай тая далёкая і не зусім зразумелая вайна станецца для нас сапраўды апошняю. Так хочам мы, так хочаць нашы дзеці. А жаданне дзяцей – закон. Усе мы хочам міру, і таму ніколі не забудзем вайны, ні той – Вялікай Айчыннай, ні гэтай – маленькай ды чужой. А чужой вайны не бывае.

**Гутарыў У. Міхно**

**На здымку:** дзеці «афганцаў»: Саша, Наташа Стомы, Тоня Кулакоўская